УДК 821.161.3.09

**В. І. Патаповіч, А. І. Белая**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

# ТРЫЯЛЕТ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА «КАЛІСЬ ГЛЯДЗЕЎ НА СОНЦА Я…» У СВЯТЛЕ ІНТЭРТЭКСТУАЛЬНЫХ АДНОСІН

**Уводзіны.** Форма трыялета ў паэтычнай творчасці М. Багдановіча заўсёды прыцягвала ўвагу даследчыкаў. Не стаў выключэннем і трыялет «Калісь глядзеў на сонца я...». Як адзначае Н. Заяц, акцэнтуючы ўвагу на новым змесце традыцыйнай формы трыялета, у гэтым творы «гуллівая», пацяшальная форма паслужыла для перадачы філасофскага зместу, абазначэння экзістэнцыйнага пытання. У вершы атрымлівае развіццё дэкадэнцкі матыў адзіноты і незразумеласці: лірычны герой здольны ўзняцца над цемрай паўсядзённасці і абывацельства, аднак яго выстаўляюць на пасмешышча. Тым не менш ён не адмаўляецца ад свайго ведання пра існаванне іншага, больш дасканалага свету: *«Няхай усе з мяне рагочуць, / Адповедзь вось для іх мая: / Калісь глядзеў на сонца я, / Мне сонца асляпіла вочы»* [1, с. 140]. Як сцвярджае даследчыца, трыялет па змесце выразна пераклікаецца з рандо «Узор прыгожы пекных зор», санетам «На цёмнай гладзі сонных луж балота...», створанымі ў рэчышчы эстэтыкі «чыстай красы», бо «таксама пабудаваны на супрацьпастаўленні высокага і нізкага, прыгожага і агіднага, «сонца» і «цемені». Разам з тым літаратуразнаўцы нярэдка адзначалі грамадзянскае гучанне верша, ігнаруючы і яго сапраўднае зместавае напаўненне, і кантэкст усёй нізкі. Падобнае прачытанне, відаць, было абумоўлена панаваннем метаду сацрэалізму, калі творы інтэрпрэтаваліся ў адпаведнасці з яго канонамі [2].

**Асноўная частка.** Пры ўважлівым прачытанні трыялета «Калісь глядзеў на сонца я...» мы заўважылі ў яго змесце алюзію на постаць Галілея Галілея (1564—1642), вядомага італьянскага фізіка, астранома і філосафа, заснавальніка прыродазнаўства, і пачалі шукаць аргументы на карысць гэтай версіі, якія і прапануюцца ў даным артыкуле. Наша меркаванне магло б здацца адвольным, каб не той факт, што ў 1914 годзе М. Багдановіч зноў звярнуўся да асобы Галілея, прычым непасрэдна: яго памяці творца прысвяціў артыкул-нататку «Безумец», напісаную да 350-годдзя з дня нараджэння вучонага (на нашу думку, рускаму слову «безумец» у найбольшай ступені адпавядае беларускае слова «ўтрапёны», г. зн. апантаны нейкай ідэяй). Артыкул мае падзагаловак «Памяці Галілея». Упершыню ён быў апублікаваны ў газеце «Голос» 5 лютага 1914 г. і датуецца годам надрукавання. Аўтарства М. Багдановіча было пацверджана яго бацькам Адамам Ягоравічам. Як сцвярджае Н. Базар, «гістарычныя падзеі, асобы таксама выступаюць крыніцай інтэртэксту» [3, с. 17].

Той, хто імкнецца да галавакружных вышынь і гэткіх жа думак, па словах М. Багдановіча, «неизменно получает название безумца. Даже если бы его мысли были основаны на несокрушимых математических доказательствах» [1, с. 140]. Паводле энцыклапедычных крыніц, Галілей абвергнуў памылковыя палажэнні вучэння Арыстоцеля і заклаў асновы сучаснай механікі. Ён адным з першым пачаў выкарыстоўваць тэлескоп для назірання за нябеснымі аб'ектамі, адкрыў на залацістым Сонцы цёмныя ўчасткі паверхні, т. зв. плямы. Фактычна дзякуючы гэтаму адкрыццю і нарадзілася прымаўка аб неідэальнасці кожнага, хто жыве на свеце: «І на сонцы ёсць плямы…». Вялікі астраном зразумеў, што не толькі Зямля, а і іншыя планеты маюць спадарожнікі, а значыць, іменна Сонца — цэнтр Сусвету. Такім чынам, ужо пры жыцці Галілей набыў вядомасць як актыўны прыхільнік геліяцэнтрычнай сістэмы, што прывяло да сур'ёзнага канфлікту вучонага з каталіцкай царквой. Тэорыю вучонага, выкладзеную ў кнізе «Зорны веснік», прызналі ерэтычнай, а самога яго пад страхам смерці прымусілі выпрачыся сваіх поглядаў. Галілеа публічна зачытаў тэкст адрачэння, але розумам і душой застаўся верным зробленым адкрыццям. Нават і пасля гэтага вучоны працягваў назіранні ў тэлескоп, пакуль не страціў зрок з-за таго, што часта глядзеў на Сонца [4, с. 23].

Менавіта ў радках *«Калісь глядзеў на сонца я, / Мне сонца асляпіла вочы…»* няма непасрэднай адсылкі да чужога тэксту, і ўсё ж гэты фрагмент пашырае, мадыфікуе семантыку тэксту М. Багдановіча за кошт гісторыка-культурных асацыяцый. Сярод варыянтаў аўтографаў трыялета М. Багдановіча ёсць і такі: *«Таму, што светла, сэрцу міла, / Не ў сорам слепата мая»* [1, с. 606].

З фактам слепаты Галілея звязана наступная гіпотэза, вылучаная ў 2009 годзе. Вядома, што ў 1610 годзе Галілей стаў першым вучоным, які назіраў у тэлескоп Сатурн. Ён убачыў каля планеты дзве плямы і выказаў меркаванне, што гэта спадарожнікі Сатурна. Тое, што выяўленыя Галілеем «плямы» — гэта кольцы, якія акружаюць Сатурн, у 1655 годзе даказаў Хрысціян Гюйгенс. Прынята лічыць, што Галілей не змог убачыць кольцы таму, што створаны ім тэлескоп не быў дастаткова моцным. Аднак італьянскія вучоныя выказалі меркаванне, што ўбачыць кольцы Галілею мог перашкодзіць яшчэ і дэфект зроку, які вучоны меў ад нараджэння. Гэтае захворванне ў той ці іншай ступені назіралася ў Галілея на працягу ўсяго жыцця і магло пакласці адбітак на зробленыя ім адкрыцці. Калі гэта так, то, магчыма, менавіта з гэтай прычыны вялікі астраном не змог заўважыць кольцы Сатурна. У сувязі з выказаным меркаваннем быў намер эксгумацыі парэшткаў вучонага, пахаванага ў фларэнційскім саборы Санта-Крочэ, і правядзення даследавання ДНК. Фінансаванне павінна было скласці 300 тысяч еўра. На сённяшні дзень пра вынікі нічога не вядома [5].

© Патаповіч В. І., Белая А. І., 2022



Рэпазіторый БарДУ

Як адзначае А. Шалемава, сваім пафасам артыкул «Безумец» часткова супадае з настроем публіцыстычных матэрыялаў на рускай і ўкраінскай мовах, у якіх М. Багдановіч раскрываў своеасаблівасці беларускага нацыянальна-вызваленчага руху пач. ХХ ст., яго адраджэнскі характар. У лепшых прадстаўніках гэтага руху паэт і публіцыст бачыў высокую адданасць праўдзе, самахвярнасць. Аўтар спалучае пафас нацыянальна-вызваленчай барацьбы з матывам М. Горкага «Безумству храбрых поём мы песню». Магчыма, у атмасферы нявер'я антырэвалюцыйных, антынацыянальных сіл у справу нацыянальна-культурнага адраджэння беларускага народа М. Багдановіч праецыраваў лёс Галілея, вучонага-папярэдніка, непасрэдна і на сябе. Таму твор робіцца своеасаблівым маніфестам свабоднага духу, няскоранасці, вернасці высокай ідэі. Публіцыст узвышае, гераізуе «ўтрапёных», ставіць іх у агульначалавечы рад непераможных праўдалюбцаў, якія сваім інтэлектам і здольнасцямі пранізваюць цёмную даль стагоддзяў. Ён праціпастаўляе праўдзівы суд гісторыі і ганебнае судзілішча цемрашалаў, калі вучоны быў вымушаны ўрачыста каяцца ў сваіх навуковых ідэях, як у цяжкіх грахах, выракацца іх, як памылак.

Галілеа Галілей узвышае сябе над абставінамі адным жэстам, адной фразай-сцверджаннем «А ўсё ж такі яна круціцца!». Яркім публіцыстычным штрыхом з'яўляецца ўведзенае ў артыкул чатырохрадкоўе з верша П. Беранжэ «Les fous» («Безумцы»). *«Если б завтра земли нашей путь / Осветить утром солнце забыло, / Тотчас, верно б, весь мир осветила / Мысль безумца какого-нибудь»* [1, с. 345]. Відавочны асветніцкі рацыяналізм Багдановіча ўдала знітоўвае спрадвечныя матывы барацьбы святла і цемры з непарушнай верай у перамогу розуму.

**Заключэнне.** Зварот да тэкстаў трыялета М. Багдановіча «Калісь глядзеў на сонца я… » і публіцыстычнай нататкі «Безумец» пераконвае ў тым, што асоба Галілея прыцягвала асаблівую ўвагу беларускага класіка. Па-першае, гэты вобраз выступае носьбітам спрадвечнага матыву барацьбы святла і цемры. Акрамя таго, можна з вялікай доляй упэўненасці сцвярджаць, што М. Багдановіч праецыраваў лёс славутага вучонага і непасрэдна на сябе, імкнучыся гэтак жа ўзвысіцца над неспрыяльнымі жыццёвымі абставінамі: апошнія гады жыцця слабы здароўем Галілей правёў у адзіноце і слепаце. Мовай публіцыстыкі М. Багдановіч стварае вобраз чалавека, апантанага ідэяй, падкрэслівае яго вялікую ролю ў гісторыі навукі, а сродкамі мастацкага маўлення супрацьпастаўляе сонца і цемру, высокае і нізкае, прыгожае і агіднае.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. *Багдановіч, М.* Поўны збор твораў : у 3 т / М. Багдановіч. — 2-е выд. — Мінск : Беларус. навука, 2001. — Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. — 752 с.

2. *Заяц, Н. В.* Трыялет Максіма Багдановіча: новы змест традыцыйнай формы [Электронны рэсурс] / Н. В. Заяц. — Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/bitstream/doc/pdf/ . — Дата доступу: 10.04.2022.

3. *Базар, Н. М.* Інтэртэкстуальнасць беларускай паэзіі мяжы ХХ—ХХІ стст.: функцыі і спецыфіка : аўтарэф. … дыс. канд. філал. навук : 10.01.01 / Н. М. Базар ; ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі". — Мінск, 2021. — 30 с.

4. *Шоричева,* А. Свет далёких планет / А. Шоричева // Загадки истории. — 2022. — № 9. — С. 23.

5. Увлечение астрономией довело Галилея до слепоты [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://mir-znaniy.com /uvlechenie-astronomiej-dovelo-galileya-do-slepoty/ . — Дата доступу: 10.04.2022.


УДК 37.016:811.161.3:371.39

**В. І. Патаповіч, В. М. Шавель**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

## АКТЫВІЗАЦЫЯ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ ТВОРЧЫХ ЗАДАННЯЎ

**Уводзіны.** Адным з самых распаўсюджаных і правераных практыкай школьнага навучання шляхоў павышэння эфектыўнасці ўрокаў беларускай мовы ў школе з'яўляецца выкарыстанне творчых заданняў.

Метады і формы арганізацыі сучаснага ўрока павінны быць арыентаваны не на засваенне гатовых ведаў, а на іх самастойнае адкрыццё, на развіццё творчых здольнасцей і актывізацыю пазнавальнай дзейнасці вучняў, бо «развіццёвы эфект урока дасягаецца, з аднаго боку, за кошт сацыяльна і педагагічна абумоўленага, маўленча арыентаванага зместу навучання, а з другога — за кошт спецыяльным чынам арганізаванай вучэбнай дзейнасці як дзейнасці пошукавай, пазнавальна-актыўнай, заснаванай на вырашэнні супярэчнасцей ў працэсе прадметна арыентаванага суразмоўніцтва» [1, с. 111]. Пазнавальная актыўнасць рэалізуецца тады, калі вучань адчувае патрэбу рашыць тую ці іншую задачу і ўмее карыстацца рознымі спосабамі рашэння такіх задач, выказаць індывідуальнае бачанне аб'екта, рабіць самастойныя вывады.

© Патаповіч В. І., Шавель В. М., 2022



Рэпазіторый БарДУ